епархии. Очевидно, что попытки вытеснить из общественной жизни религию и Церковь были утопичны, т. к. религиозная жизнь и в стране, и в регионе развивалась.

Гонения Церкви ослабили её внешне, но одновременно с этим сплотили верующих. Православная Церковь выстояла благодаря широкой народной поддержке, «…она – нечто такое, что невозможно уничтожить атеистической пропагандой и мероприятиями по закрытию храмов. Несомненный показатель духовного возрождения – рост религиозного сознания, синтез стремлений духовенства и народа…», «…сам Христос создал обетование непоколебимости Церкви, сказав, что врата адовы не одолеют Церкви Его…» [1, с. 210].

### Список литературы

1 **Козлова, Н. Н.** История Гомельской епархии в 1941–1965 годы / Н. Н. Козлова. – Гомель : Ред. газ. «Гомельская праўда», 2022. – 212 с.

2 **Цыкунов, С. В.** Чонский монастырь. История и судьбы / С. В. Цыкунов, Н. Н. Козлова. – Гомель : Барк, 2018. – 415 с.

3 **Беглов, А. Л.** В поисках «безгрешных катакомб». Церковное подполье в СССР / А. Л. Беглов. – М. : Арефа, 2008. – 352 с.

4 **Силова, С. В.** Православная церковь в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.) / С. В. Силова. – Гродно : ГрГУ, 2003. – 105 с.

УДК: 908(476.2):070.488

## ГОМЕЛЬШЧЫНА НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ ЛІМ

*В. А. КАСЦЕНІЧ*
*Установа адукацыі*
*“Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”, г. Мінск*

“ЛіМ” – поўная назва “Літаратура і мастацтва” – гэта газета творчай інтэлігенцыі Беларусі, “летапіс беларускай культуры”, як назваў яе галоўны рэдактар А. Чарота [1]. Задача выдання – даносіць да чытача інфармацыю пра знакавыя падзеі ў культуры Беларусі, знаёміць з мастацкімі, тэатральнымі, літаратурнымі, кінематаграфічнымі і іншымі культурнымі падзеямі, што адбываюцца ў нашай краіне і за яе межамі. За свой шаноўны васьмідзесяцігадовы юбілей на старонках газеты друкаваліся выбітныя мастакі слова: Іван Мележ, Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Уладзімір Караткевіч і многія іншыя. Сярод іх нямала прадстаўнікоў Гомельшчыны. Вывучэнне публікацый ЛіМа і сістэматызацыя – гэта стварэнне своеасаблівай культурнай энцыклапедыі беларусаў.

Задача даследавання – устанавіць сучасны вобраз Гомельшчыны ў штотыднёвіку “ЛіМ”. Матэрыялам для даследавання паслужылі публікацыі, якія змешчаны ў газеце за першую палову 2022 г. Усяго 26 нумароў.

За перыяд з 1 студзеня па 1 ліпеня 2022 г. намі выяўлена 37 матэрыялаў, якія маюць адносіны да людзей, што родам з Гомельшчыны і падзей, якія тут адбываліся.

Жанравы дыяпазон публікацый даволі разнастайны. Гэта і нататкі, да якіх адносіцца форма інфармавання чытачоў, якая характарызуецца сцісласцю, аператыўнасцю, адсутнасцю аналізу факта, падзеі і «адказвае на пытанні што, дзе, калі?» [2, с. 10.] Усяго выяўлена 20 нататак. Другі распаўсюджаны жанр – справаздача – сем матэрыялаў з інфармацыяй аб падзеі, дзе дзеянне выяўлена ў слове. Такімі падзеямі могуць быць сходы, канферэнцыі, з'езды і г. д. Сярод жанравай разнастайнасці былі заўважаны яшчэ і рэцэнзіі, да якіх мы аднеслі тры публікацыі. Каб пісаць у гэтым жанры, журналіст інтэрпрэтуе і ацэньвае навуковыя, грамадска-палітычныя, мастацкія творы. У рэцэнзіі разглядаюцца добрыя якасці і недахопы працы пісьменніка, мастака ці навукоўца, робяцца высновы [4, с. 89]. Акрамя гэтага, аўтары штотыднёвіка па адным разе скарысталіся такімі жанрамі, як артыкул (у аснове ляжаць факты, асобныя сітуацыі; галоўная асаблівасць – развіццё адной, строга вызначанай думкі, лагічная паслядоўнасць, канкрэтнасць, абагульненне вялізнага фактычнага матэрыялу [2, с. 21]; нарыс – жанр, дзе ўзнаўляецца падзея, з'ява рэчаіснасці, партрэт чалавека з дапамогай літаратурных і мастацкіх метадаў [2, с. 43]; інтэрв’ю – “дыялог двух суразмоўцаў, выбудаваны з мэтай атрымання меркавання па тых ці іншых пытаннях, падзеях, фактах” [2, с. 13]. На старонках газеты таксама друкуюцца празаічныя творы пісьменнікаў Гомельшчыны.

Устаноўленыя публікацыі можна аб’яднаць у пяць груп па тэматычным прынцыпе: 1) дзейнасць Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі; 2) дзейнасць бібліятэк і асобных пісьменнікаў; 3) тэатральнае мастацтва; 4) жывапіс, выяўленчае мастацтва; 5) дзейнасць Гомельскага аблвыканкама.

1 Да першай групы адносяцца 24 публікацыі. 15 з іх – нататкі, тры справаздачы, тры прозы, дзве рэцэнзіі і адзін нарыс. Яны ўтрымліваюць інфармацыю пра конкурсы і акцыі, прынятыя рашэнні і падвядзенні вынікаў, супрацоўніцтва і праекты, узнагароджанні, выданні сустрэчы. Многія пісьменнікі, пра якіх піша ЛіМ, з’яўляюцца сябрамі Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аналізуючы публікацыі, мы ўстанавілі, што дзейнасць аддзялення вельмі актыўная і разнастайная.

Па-першае, творцы былі арганізатарамі трох акцый, дзве з якіх – міжнародныя. Сутнасць першай – у папулярызацыі кніг, дзе перададзеныя творчай суполкай і іншымі жадаючымі выданні адправіліся ў сельскія бібліятэкі розных устаноў для папаўнення фонду (ЛіМ, 6 студзеня, с. 2). Іншая ж была звязана з правядзеннем фестывалю кнігі #ЧЫТАЙГОМЕЛЬ. У выніку арганізаванай акцыі на сцэне выступілі два дзясяткі знакамітых аўтараў і пісьменнікаў-пачаткоўцаў (ЛіМ, 23 студзеня, с. 2). Акрамя гэтага,

Гомельскае абласное аддзяленне актыўна папулярызуе кнігу і за мяжой. Была праведзена анлайн-акцыя пад назвай “Чытанне, якое збліжае”, падчас якой юныя масквічы знаёміліся з беларускімі аўтарамі (ЛіМ, 1 красавіка, с. 2).

Па-другое, пісьменнікі выступілі арганізатарамі шэрагу конкурсаў. «І. П. Шамякін. “Сэрца на далоні”» – гэта не толькі назва рамана таленавітага пісьменніка Гомельшчыны, а яшчэ і літаратурны конкурс, які быў арганізаваны аддзяленнем і прайшоў 3–4 верасня 2022 г. у Добрушы. Найлепшыя кароткія апавяданні апублікавалі ў выданнях абласнога аддзялення СПБ (ЛіМ, 4 лютага, с. 2). Таксама Гомельскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі быў арганізаваны Міжнародны конкурс паэтычнага перакладу “Сожскія берагі сяброўства. Сожские берега дружбы” (ЛіМ, 1 ліпеня, с. 2). Да іх дзейнасці таксама можна аднесці ўнікальны праект, у якім прафесійныя літаратары і маладыя аўтары пераклалі на беларускую мову творы больш чым 40 паэтаў з 25 краін свету (ЛіМ, 27 мая, с. 3). “Захаваем свет разам!” – гэта конкурс чытальнікаў, які якраз быў арганізваны на свяце. Да ўдзелу запрашаліся вучні гомельскіх школ ва ўзросце ад 12 да 17 гадоў. Падлеткі на працягу чатырох тураў змагаліся за галоўны прыз – творчую пуцёўку на вялікае восеньскае свята ў старажытны Добруш (ЛіМ, 27 мая, с. 2).

Па-трэцяе, было праведзена мноства сустрэч як з чытачамі, так і з калегамі з Бранска (ЛіМ, 15 красавіка, с. 2). Напрыклад, у пачатку года Аляксей Сазанчук наведаў Барбароўскую базавую школу Мазырскага раёна. Аўтар расказаў, як жылі яго аднагодкі ў далёкія пасляваенные гады. Яго галоўны заклік: “Не губляць свае карані, помніць, што наша дзяржаўная моц у адзінстве” (ЛіМ, 6 студзеня, с. 3). Нарыс ў 25 нумары быў прысвечаны Марку Смарговічу. Другі ж пісьменнік – Уладзімір Гаўрыловіч – завітаў да старшакласнікаў і педагогаў у гарадскі ліцэй № 1 г. Гомеля ў канцы навучальнага года (ЛіМ, 10 чэрвеня, с. 3). Уладзімір Мікалаевіч таксама арганізаваў творчую сустрэчу і ў Жыткавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Візіт быў звязаны з Годам гістарычнай памяці і Днём славянскага пісьменства і культуры (ЛіМ, 3 чэрвеня, с. 2). Яго паэзія дае напоўніцу ўявіць Вялікую Айчынную вайну. Аднак творца не абмежаваўся толькі гэтай тэмай, ён выдатна апяваў хараство наваколля, роднага сэрцу Палесся (ЛіМ, 25 чэрвеня, с. 5).

Па-чацвёртае, мастакі слова дзяліліся на старонках газеты сваімі творчымі здабыткамі, аналізавалі творчасць калег, з цеплынёй успаміналі тых, з кім развіталіся назаўсёды. Так, у лютым 2022 г. з’явілася інфармацыя, што перастала біцца сэрцы таленавітага пісьменніка Гомельшчыны – Васіля Ткачова (ЛіМ, 18 лютага, с. 3). За 26 нумароў гэтага года былі выдзелены тры публікацыі з апавяданнямі і ўрыўкамі з раманаў аўтараў, якія ўваходзяць у Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў: Уладзіміра Гаўрыловіча, Васіля Ткачова і Ганны Атрошчанка (20 мая, с. 9, 6 студзеня,

с. 9, 6 мая, с. 9). У 11 нумары мы пабачылі інфармацыю аб новай кнізе Лідзіі Долбікавай “Мульцяшная жывая азбука ў вершах і малюнках”. Надрукаваў яе выдавецкі дом “Гомельская праўда”. Аўтар зрабіла кнігу ў выглядзе цыклу вершаў пра жывёл і птушак на літары алфавіта (ЛіМ, 18 сакавіка, с. 6). У наступнай прааналізаванай публікацыі вялікую рэцэнзію пакінуў на дзённік Уладзіміра Ліпскага Анатоль Зэкаў. Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі нарадзіўся ў вёсцы Шоўкавічы Рэчыцкага раёна, да якой часткова звяртаўся на старонках сваёй кнігі (ЛіМ, 21 студзеня, с. 6). Апошняя тэма – узнагароджанне творцаў (ЛіМ, 20 мая, с. 2).

2 Другая група публікацый звязана з дзейнасцю бібліятэк і асобных пісьменнікаў. У 2022 г. адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Міколы Гамолкі, таму на Жыткавіччыне ў парку, які якраз носіць назву пісьменніка, адкрылі інфармацыйны стэнд, прысвечаны яму (ЛіМ, 25 сакавіка, с. 2). У пачатку года на старонках ЛіМа з'явілася рэцэнзія на кнігу Міколы Чарняўскага “Вяселле ў Налібоках”, якая пабачыла свет у выдавецтве “Мастацкая літаратура”. Аўтар нарадзіўся ў Буда-Кашалёўскім раёне ў 1943 годзе, але ўжо ў 15 гадоў дэбютаваў вершамі ў газеце “Піянер Беларусі”. У новую кнігу ўвайшлі жыццёвыя бы́лі, пражытыя самім аўтарам. Мікола Чарняўскі апісвае сваіх вясковых герояў праўдзіва, як запомніў, таму ў яго гэта атрымалася вельмі душэўна (ЛіМ, 6 студзеня, с. 7). Цікавае выданне выйшла і ў серыі «Падарожжа па родным краі», якую выпускае выдавецтва “Беларусь”. Далей з’явілася незвычайная кніга: «Зямля радзімічаў, ці Дарогамі Гомельскага Пасожжа», якая адрозніваецца ад іншых з гэтай серыі. У ёй вялікая колькасць ілюстрацый, а змест знаёміць нас з цікавымі мясцінамі раёна і знакамітымі людзьмі (ЛіМ, 27 мая, с. 7). Газета ЛіМ падтрымлівае сучасных беларускіх аўтараў, таму ў чэрвені друкаваліся творы Вольгі Ропат (ЛіМ, 17 чэрвеня, с. 9). #ЧЫТАЙГОМЕЛЬ – гэта свята кнігі, якое праводзілася 29 мая. Яго арганізатарам выступіла Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя У. І. Леніна. Фестываль падрымлівае цікавасць да кнігі і чытання. Акрамя гэтага, былі шырока прадэманстраваны дасягненні выдавецкай і кнігагандлёвай сфер (ЛіМ, 27 мая, с. 3).

3 У групе публікацый “Тэатр” мы выявілі нататку і артыкул. Нататка адносіцца да памяці заслужанага работніка культуры Беларусі, тэатральнага рэжысёра Міхаіла Коласа (ЛіМ, 21 студзеня, с. 3). Артыкул быў напісаны аб Вялікім тэатры Беларусі, які святкаваў 89-ы дзень нараджэння і таму дарыў падарункі. Адзін з якіх – гэта майстар-клас заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь, саліста тэатра Алега Мельнікава (ЛіМ, 22 студзеня, с. 14).

4 Да групы “Мастацтва” мы аднеслі толькі адну справаздачу. У ёй ішла гаворка пра Леаніда Хобатава. Ён з’яўляецца адным з самых вядомых мастакоў Гомельшчыны. У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь прайшоў яго выставачны праект, дзе было прадстаўлена каля 30 твораў

жывапісу з фондаў Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Беларускага саюза мастакоў і калекцыі аўтара (ЛіМ, 28 студзеня, с. 12).

5 Да апошняй групы аднасіцца інтэрв'ю начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніса Язерскага. Ён распавядаў пра тое, чым жыве рэгіён і як плануе зацікаўліваць (ЛіМ, 3 чэрвеня, с. 4).

Гомельшчына даволі шырока прадстаўлена на старонках штотыднёвіка "ЛіМ". Амаль ва ўсіх нумарах ёсць хаця б адзін матэрыял па тэме, а ў некаторых – і больш. Гэта сведчыць аб высокім творчым і культурным патэнцыяле краю. Большая частка матэрыялаў датычыцца літаратурнага жыцця рэгіёна, што гаворыць пра актыўную дзейнасць творцаў Гомельшчыны, іх жаданне далучыць да мастацкага слова беларускага як мага большую колькасць людзей.

Сучасны вобраз Гомельшчыны па матэрыялах штотыднёвіка "ЛіМ" за першае паўгоддзе 2022 г. бачыцца наступным. Гэта шэраг культурных устаноў і творчы саюз пісьменнікаў, дзе працуюць свядомыя, патрыятычна настроеныя людзі – таленавітыя, апантаныя, якія ганарацца сваёй спадчынай, папулярызуюць яе, імкнуцца данесці да маладога пакалення ідэалы міру, дабра, справядлівасці.

**Спіс літаратуры**


1 **Рублеўская, Л.** Галоўны рэдактар "ЛіМа" Аляксей Чарота пра юбілей выдання [Электроны рэсурс] / Л. Рублеўская – Рэжым доступу : zviazda.by/be/news/20220225/1645797453–galouny–redaktar–lima–alyaksey–charota–pra–yubiley–vydannya. – Дата доступу : 01.12.2022.

2 **Бобков, А. К.** Газетные жанры : учеб. пособие / А. К. Бобков. – Иркутск : Иркут. ун-т, 2005. – 64 с.

3 Беларусь : энцыклапедычны даведнік / рэд. калегія : Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. – 800 с.

4 **Краснянский, Д. Е.** Теория и практика массовой информации : учеб. пособие / Д. Е. Краснянский. – М. : МГТУ ГА, 2006. – 116 с.



УДК 385.81


## ПЛАНЫ ФАШИСТСКИХ АГРЕССОРОВ И ИХ ПОСОБНИКОВ. КОЛЛАБОРАЦИОНИЗМ: СОВРЕМЕННАЯ ОЦЕНКА


*С. В. КОТЮЩЕНКО, И. С. МАКСИМЕНКО, С. В. ПЕТРУСЕВ*
*Учреждение образования*
*«Белорусский государственный университет транспорта», г. Гомель*


Нападение на СССР преследовало экономические, политические и идеологические цели. Крах государства площадью в 22,4 млн км$^2$ превращал